# НАШЫ ПОСПЕХІ І СПРАВЫ ТАБЕ, РАДЗІМА!

**Па ўсёй краіне ўсё шырэй разгортваецца спаборніцтва за дастойную сустрэчу слаўных юбілеяў — 50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Гэтыя даты савецкія людзі імкнуцца адзначыць новымі працоўнымі справамі.**

**У нашым універсітэце ўжо даўно вядзецца ўсебаковая падрыхтоўка да вялікіх свят працоўных усяго свету.**

**На днях на факультэтах пачаліся сходы, прысвечаныя прыняццю сацыялістычных абавязацельстваў у гонар 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. Першае слова ў гэтым напрамку сказаў калектыў кафедры гісторыі КПСС. На кафедры вырашана да 7-га лістапада 1967-га года падрыхтаваць да абароны тры доктарскія і шэсць кандыдацкіх дысертацый, падрыхтаваць да друку вучэбны дапаможнік «КПСС у перыяд завяршэння будаўніцтва сацыялізма і паступовага пераходу да камунізма (1937—1967 гг.)», распрацаваць і пачаць чытанне новых спецкурсаў. Гэта толькі невялікая частка таго, што запісана ў абавязацельствах кафедры.**

**Прыняцце сацыялістычных абавязацельстваў—важнае мерапрыемства. Партыйныя бюро, дэканаты, грамадскія арганізацыі факультэтаў павінны патрабавальна адносіцца да прапаноў кафедр, студэнцкіх груп з тым, каб уключыць у абавязкі самае галоўнае, істотнае, рэальнае. Перагрузка абавязацельстваў мноствам пунктаў можа знізіць ўзровень кантролю за іх выкананнем.**

**Галоўным у абавязацельствах факультэцкіх калектываў павінна быць імкненне павысіць узровень навукова-даследчай і выхаваўчай работы, цясней звязаць яе з жыццём. Неабходна ўлічыць узрастаючае значэнне прапаганды на заводах, ва ўсіх падшэфных калектывах.**

**Але прыняцце абавязацельстваў — гэта толькі пачатак вялікай работы. Неабходна разумна арганізаваць выкананне ўсіх пунктаў, забяспечыць нагляднасць спаборніцтваў, трэба своечасова ўносіць падсказаныя жыццём карэктывы.**

**50-годдзю Савецкай улады — дастойную сустрэчу!**



Генадзь Савіцкі ў гэтым годзе заканчвае вучобу ва універсітэце. Выпускнік упарта рыхтуецца да абароны дыпломнай працы, тэма якой: «Малагабарытныя апаратурныя запамінаючыя апараты». Абараніць яе на «выдатна»— вось яго падарунак 50-годдзю Савецкай улады.


**Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!**

# Беларускі ўніверсітэт

**ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА**

№ 30 (643) Пятніца, 14 кастрычніка 1966 года. Год выдання XIX. Цана 2 кап.


# ВЫШЭЙ СЦЯГІ, КАМСАМОЛІЯ!

У лютым месяцы 1966 года ва ўсіх пярвічных арганізацыях універсітэта была прынята «Ленінская эстафета слаўных спраў» камсамольцаў БДУ у гонар 50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Гэта свайго роду творчы паход моладзі за яшчэ большае, настойлівае вывучэнне тэарэтычнай спадчыны Ул. І. Леніна, за падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў —будучых камандзіраў вытворчасці, арганізатараў грамадска-карысных спраў, за маральнае удасканаленне кожнага члена нашай арганізацыі на прыкладзе жыцця і дзейнасці Ільіча. «Эстафета» выклікала шмат спрэчак — карысных і патрэбных. Яна абмяркоўвалася на працягу 20 дзён. У гэтыя дні па універсітэту прайшло каля 100 групавых, амаль паўсотні курсавых і пяць факультэцкіх сходаў, дзе «Эстафета» была прынята аднагалосна. Здавалася, што камсамольцы прыступілі да ажыццяўлення планаў, абмеркаваных на сходах. Але не прайшло і месяца, як у многіх арганізацыях аб «Эстафеце» камсамольцы забыліся.

Праўда, так было не ва усіх арганізацыях, але і цяпер ва ўніверсітэце яшчэ не адчуваецца сапраўднага спаборніцтва. Да гэтага часу ні ў адной арганізацыі не створаны штабы для кіраўніцтва «Эстафетай», ні ў адной насценнай газеце, акрамя «Слова філолага», не асвятляецца яе ход. Некаторыя камсамольцы яшчэ дэталёва не ведаюць мэты і накіравання гэтага спаборніцтва, яго асаблівасцей. Адзіная арганізацыя, дзе нядрэнна асвятляюцца на перыядычна абнаўляемых фотастэндах справы камсамоліі—гэта камсамольская арганізацыя філфака. Але і там нямала недахопаў. Штабы «КП» на гістарычным, біялагічным, геаграфічным і юрыдычным факультэтах аб іх зусім забыліся. Пасты «КП» на курсах створаны толькі на фізфаку і філфаку. Факультэцкія ж «Летапісы» яшчэ не створаны ні ў адной арганізацыі. «Дыскусійныя клубы» таксама не развярнулі работу, канцэртныя і агітацыйныя брыгады на факультэтах ствараюцца вельмі марудна. Шырокія шэфскія сувязі (у поўным сэнсе гэтага слова) маюць тры—чатыры арганізацыі.

З гэтага можна зрабіць вывад, што многія нашы камсамольскія важакі навучыліся вылучаць перад моладдзю задачы, але па-сапраўднаму не мабілізуюць моладзь на іх здзяйсненне. Трэба хутчэй пераадолець гэты недахоп, перайсці ад слоў да канкрэтных спраў, усё зрабіць для таго, каб наша «Эстафета» дапамагала усім студэнтам у вучобе, арганізацыі цікавага адпачынку.

Наша «Эстафета» выклікана часам не дзеля таго, каб, як кажуць, прагрымець у сценах вну. Цяпер вытворчасць патрабуе асабліва кваліфікаваных спецыялістаў — арганізатараў, кіраўнікоў, а гэта і прадугледжана праграмай спаборніцтва паміж групамі, курсамі, факультэтамі ва ўсіх галінах нашага студэнцкага жыцця. Дзелавое спаборніцтва, як вядома, заўсёды рухала творчую ініцыятыву людзей. Прымяняючы гэтую ініцыятыву на практычнай рабоце, факультэты будуць мець дзесяткі і сотні добрых спраў, якія аб'яднаюцца ў адну вялікую справу ўсяго універсітэта.

Вядома, мы прывыклі, што спаборніцтва больш падыходзіць да вытворчасці. Моладзі тут усё вядома! Мы ж пачынаем размову аб спаборніцтве ва універсітэцкай рабоце. Справа ідзе не аб уплаце камсамольскіх узносаў, а аб цэлым комплексе пытанняў арганізацыйнай і выхаваўчай работы. Магчыма, працей спаборнічаць за вытворчыя паказчыкі, за тое, скажам, хто больш вытачыць кольцаў на станку. Тут жа трэба паставіць работу так, каб за чатыры гады камсамольская арганізацыя падрыхтавала з кожнага свайго выхаванца і добрага спецыяліста, схільнага да актыўнай грамадскай дзейнасці, нядрэннага арганізатара, кіраўніка. Вось тут нам і дапаможа спаборніцтва. Гэта будзе пачатак добрай традыцыі універсітэцкай камсамоліі. Наша вну — ідэалагічнае. Таму, магчыма, слова «спаборніцтва» у многіх выклікае ўсмешку. Гэтага баяцца не трэба. Задача камсамольскіх камітэтаў—накіраваць работу ў тым напрамку, каб у кожнай групе, напрыклад, ішла барацьба і за павышэнне актыўнасці, і за тое, каб падрыхтаваць больш здольных спецыялістаў. Неабходна змагацца і за тое, хто больш падрыхтуе выдатнікаў вучобы, і за тое, у якой групе будзе менш неўспяваючых.

Тут атрымліваецца прамая і адваротная узаемазалежнасць. Чым менш будзе неўспяваючых, тым больш будзе падрыхтавана добрых спецыялістаў. І чым больш будзе арганізатараў, тым больш будзе слаўных спраў (навыкі арганізатара яны будуць атрымліваць на практыцы). А каб што-небудзь зрабіць—трэба падрыхтаваць базу для спраў. Ствараючы яе, напрыклад, «Клубы цікаўных», «Дыскусійныя клубы» і іншыя, камсамольцы будуць лепш арыентавацца, набываць навыкі арганізатараў. Возьмем такі прыклад. Рэспубліка на універсітэт мае вялікую надзею. Прадпрыемствы Мінска чакаюць ад нас прапагандыстаў, арганізатараў вытворчасці, дзіцячыя пакоі чакаюць сапраўдных выхаванцаў, а школы —выдатных педагогаў. Калі мы за час нашага спаборніцтва («Ленінская эстафета» разлічана на чатыры гады) прыцягнем да грамадскай дзейнасці 90 працэнтаў усёй нашай моладзі— у нас будзе мноства карысных спраў. Самі студэнты змогуць культурна і больш цікава праводзіць свой вольны час.

Дабіцца гэтага мы зможам толькі тады, калі кожны камсамолец (менавіта кожны) будзе добрасумленна адказваць перад таварышамі па арганізацыі за свае учынкі, стане дапамагаць сваім сябрам па вучобе. Адным словам, калі ён стане штодзённа жыць інтарэсамі калектыва.

Вынікі першага этапа «Ленінскай эстафеты» будуць падведзены да 7-га лістапада 1967 года, апошняга — чацвертага —22 красавіка 1970. Трэба, каб за гэты час наша камсамолія паднялася на новую, высокую ступень ва ўсіх галінах жыцця і дзейнасці, каб яна стала яшчэ больш згуртаванай і працаздольнай — сапраўдным баявым памочнікам партыйнай арганізацыі, рэктарата універсітэта ў падрыхтоўцы і выхаванні высокакваліфікаваных кадраў.

**М. ЦІВА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.**

# УШАНОЎВАННЕ ЮБІЛЯРА

*За актыўную навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў Ганаровай Граматай доктара гістарычных навук, прафесара кафедры гісторыі КПСС нашага універсітэта Міхаіла Яфімавіча Шкляра. У мінулую суботу ў Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ адбылося ўшаноўванне юбіляра. У яго адрас паступіла шмат цёплых віншаванняў. Рэктарат, партком і мясцком універсітэта прыпаднеслі М. Я. Шкляру прывітальны адрас.*

*Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» далучаецца да гэтых прывітанняў і жадае прафесару М. Я. Шкляру новых поспехаў.*

# ДОБРАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

*«Якое цудоўнае на зямлі было б жыццё, калі б не кравважадны Гітлер...».*

**Гэты кароткі ўрывак з пісьма, а таксама невялікі артыкул пра Пятра Дзмітрыевіча Чугунова, былога выкладчыка нашага універсітэта, які не вярнуўся з фронта, нядаўна былі надрукаваны ў насценнай газеце «Хімік».**

**Пасля апублікавання першых матэрыялаў рэдкалегія атрымала ліст ад жонкі П. Д. Чугунова:**

**«Я з захапленнем прачытала вашу газету. Выказваю вам вялікую ўдзячнасць ад сябе асабіста і ад свайго сына за тое, што ўспомнілі аб маім мужу, за тое, што памяць аб ім засталася жыць ва універсітэце».**

**Рэдкалегія накіравала сваіх карэспандэнтаў да жонкі франтавіка, яны ўзялі ў яе для публікацыі шмат цікавых пісьмаў і дакументаў П. Д. Чугунова перыяду Вялікай Айчыннай вайны.**

**Пахвальна, што рэдкалегія «Хіміка» ушаноўвае памяць тых, хто ў ліку першых стварaў славу нашага універсітэта — буйнейшай навучальнай і даследчай установы рэспублікі, хто аддаў сваё жыццё за свабоду і шчасце Радзімы. У працэсе ўсебаковай падрыхтоўкі да вялікага свята — 50-годдзя Савецкай улады лозунг «Ніхто не забыты, нішто не забыта» павінен стаць асабліва актуальным у дзейнасці ўсіх насценных газет. Правільна будзе, калі рэдкалегіі насценных газет другіх факультэтаў возьмуць прыклад з «Хіміка».**

**Б. КАЛЯДА.**

**З'ЕЗД ЗАКЛІКАЕ ЎСІХ КАМУНІСТАЎ, РАБОЧЫХ, КАЛГАСНІКАЎ, САВЕЦКУЮ ІНТЭЛІГЕНЦЫЮ АЗНАМЕНАВАЦЬ ВЯЛІКІЯ ДАТЫ—50-ГОДДЗЕ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ І 100-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА ІЛЬІЧА ЛЕНІНА — ШЫРОКІМ РАЗГОРТВАННЕМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА, РУХУ ЗА КАМУНІСТЫЧНУЮ ПРАЦУ, НОВЫМІ ДАСЯГНЕННЯМІ Ў КАМУНІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ, ДАСТОЙНЫМ УКЛАДАМ НАШАЙ КРАІНЫ ВА ЎМАЦАВАННЕ МАГУТНАСЦІ СУСВЕТНАГА САЦЫЯЛІЗМА, У СПРАВУ ПЕРАМОГАНОСНАГА РАЗВІЦЦЯ МІЖНАРОДНАГА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ.**

(З рэзалюцыі XXIII з'езда КПСС).

## Партыйнае жыццё

# СЕМ ГАДЗІН ДЗЕЛАВОЙ РАЗМОВЫ

У аўдыторыі — прыглушаны шум. Кожны, хто прышоў сюды, аб нечым раіўся са сваім таварышам, расказваў пра розныя справы, якія, магчыма, прывялі іх сюды. Але неўзабаве ўсё сціхае, камуністы філалагічнага факультэта ўважліва слухаюць справаздачу партыйнага бюро. Даклад сакратара партыйнай арганізацыі М. А. Паўленкі адразу ж ажывіў прысутных, выклікаў тую ўвагу і цікавасць, якая, нажаль, бывае яшчэ не на кожным сходзе. Коратка прааналізаваўшы ўсё лепшае, што ўдалося зрабіць камуністам (было праведзена 22 пасяджэнні партбюро, 6 сходаў, на якіх разглядаліся самыя надзённыя пытанні — ажыццяўленне рашэнняў XXIII з'езда КПСС, прыём ў партыю, вучоба, побыт студэнтаў, наладжванне цікавых вечароў, сустрэч з вядомымі людзьмі горада, рэспублікі і іншыя), дакладчык галоўную ўвагу накіраваў на тое, што яшчэ перашкаджае камуністам факультэта паспяхова вырашаць галоўную сваю задачу — выконваць запатрабаванні партыі і ўрада ў падрыхтоўцы спецыялістаў высокай кваліфікацыі.

Дакладчык называе прозвішчы камуністаў тт. Лойка, Лукашэвіча, Булацкага, Волка, Цікоцкага, Лысенка, Захараву, Пабоку, Слуку, Гарбачова. Яны заўсёды добрасумленна выконвалі ўсе даручэнні, якія ўскладвала на іх партарганізацыя. Пералік такіх камуністаў можна было б прадоўжыць. Але нічога падобнага не скажаш пра Маркелаву, якая толькі лічылася ў спісу народнай дружыны, яе нельга было бачыць на дзяжурствах, на пасяджэннях штаба. А камуніст І. П. Ганчароў 15 месяцаў не наведваў партыйных сходаў, адарваўся ад жыцця арганізацыі, за што выключаны з членаў КПСС. Ціханавец, Нікалаеў з шасці сходаў прапусцілі па два, прычым, без уважлівых прычын. Камуністы Карабіцкі, Васючэнка, Кузьмін атрымалі вымовы за няўплату партыйных узносаў.

У чым прычына ўсяго гэтага? Чаму здараюцца выпадкі парушэння дысцыпліны?

Адказваць на гэтыя пытанні не так проста. Партыйная арганізацыя факультэта штогод папаўняецца маладымі камуністамі, якія залічваюцца на вучобу. Большасць з іх кандыдаты ў члены КПСС. У новым асяроддзі, асяроддзі вышэйшай школы з імі праводзіцца шматгранная агульная і індывідуальная работа. Але гэтага, відаць, не дастаткова. Старэйшым камуністам работу з кандыдатамі ў члены КПСС трэба паставіць на самы высокі ўзровень, каб рады партыі поўніліся сапраўднымі энтузіястамі, людзьмі, адданымі рэвалюцыйнай справе, ідэям марксізма-ленінізма.

Нядаўняя Пастанова партыі і ўрада «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканаленню кіраўніцтва вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй ў краіне» патрабуе ад выкладчыкаў нашага універсітэта вырашэння многіх наспелых задач. Каб іх вырашыць, патрэбны агульныя намаганні партыйнага бюро, камітэта камсамола, дэканата, выкладчыкаў і ўсіх грамадскіх арганізацый факультэта.

У гэтым годзе ёсць многа падстаў, якія даюць права меркаваць, што навуковы і арганізацыйны ўзровень вучобы значна палепшыўся: амаль стопрацэнтнае наведванне лекцый, актыўнасць семінарскіх заняткаў. Але на факультэце яшчэ маецца і такая катэгорыя студэнцтва, як Папова, Салаўёва і іншыя, якія цягнуць факультэт назад. Да сённяшняга дня яны не ліквідавалі акадэмічнай запазычанасці, абыякава адносяцца да вучобы. Нельга слова з іх выцягнуць і на семінарскіх занятках. Цікава, навошта гэтыя выпадковыя людзі займаюць месца ва універсітэце? Партыйная арганізацыя, дэканат, выкладчыкі цягнуць іх з курса на курс, але воз, як кажуць, і сёння там. Як паказвае практыка, на вытворчасці ад такіх студэнтаў аддача благая.

Высокую партыйную прынцыповасць праявілі ў спрэчках камуністы т.т. Зярніцкі, Захарава, Ярмоленка, Літвінка, Пабока, Цішчанка, Жыдовіч. Іх размова галоўным чынам вялася аб тым, што жыццё на факультэце стала цікавейшым. 125 студэнтаў першага курса аддзялення рускай мовы і літаратуры прымаюць удзел у мастацкай самадзейнасці універсітэта. Падобныя лічбы можна назваць і на іншых курсах, дзе амаль усе студэнты ахоплены той ці іншай грамадскай работай. Адзначалася, што на факультэце нават вырашчаны свае кіраўнікі мастацкіх калектываў. Гэта Тамара Скудная, Нэля Крывашэева, Васіль Літвінка. Прамоўцамі ставіліся на абмеркаванне і пытанні вучобы, побыту, культурнага адпачынку студэнтаў і выкладчыкаў, падрыхтоўкі да сесіі, праблемы эстэтыкі паводзін студэнтаў.

Прафесарска - выкладчыцкі калектыў сваім прыкладам павінен узнімаць аўтарытэт сярод студэнтаў. Часам здараецца і так, што некаторыя выкладчыкі цесна прытрымліваюцца на лекцыі толькі праграмнага матэрыялу, а на іншыя пытанні студэнтаў адказваць адхіляюцца. Так здарылася на аддзяленні журналістыкі. Калі выкладчыка Русакова папрасілі адказаць на некаторыя ўскосныя пытанні курса, ён адмовіўся.

— У нас часта гавораць пра дрэннае наведванне лекцый, — сказаў у сваім выступленні сакратар камітэта камсамола факультэта Гарбачоў. — Але ці ва ўсім тут вінаваты студэнты? Некаторых выкладчыкаў моладзь любіць за тое, што яны стараюцца расказаць ім пра ўсё шчыра, захапляюча, не лічаць іх «шкалярамі». Да такога выкладчыка сорамна не прысці на лекцыю, але ёсць і такія, што стараюцца хутчэй вырвацца дадому, пакінуўшы ў аўдыторыі шмат нявырашаных пытанняў. Другая, на мой погляд, сур'ёзная прычына пропускаў заняткаў крыецца, як ні дзіўна, у сталовай. На лекцыі трэба выходзіць у 7 гадзін раніцы. У гэты час ніводная сталоўка горада і студэнцкага інтэрната не працуе. Большасць ідзе на вучобу галоднымі. Першую лекцыю яшчэ як-небудзь студэнты прасядзяць, а пасля ў галаве паяўляюцца цёмныя кругі і становіцца не да лекцыі.

Прафсаюзнай арганізацыі неадкладна трэба вырашыць пытанне аб новым распарадку работы сталовых інтэрнатаў. Неабходна, каб яны пачыналі працаваць з 6—6.30 раніцы. Мне здаецца, што пры жаданні гэтае пытанне можна вырашыць.

— Прыкрым з'яўляецца той факт, — адзначыў дэкан факультэта Р. В. Булацкі, — што ў нашы метадычныя кабінеты рэдка калі заглядваюць студэнты. Ці не таму здарылася так, што студэнтка 5-га курса, знаходзячыся на практыцы ў школе, ў адным слове, якое напісала пры тлумачэнні на дошцы, зрабіла дзве граматычныя памылкі. Вядома, такіх гора-студэнтаў у нас на факультэце адзінкі. Але факт застаецца фактам. І ён гаворыць аб тым, што адукацыя студэнта — наша першачарговая задача. Быў час, калі ў нас на факультэце не было ніводнага доктара навук, цяпер іх — сем. Паспяхова працуюць над доктарскімі дысертацыямі Я. Т. Цішчанка, А. Ф. Манаенкава, І. Я. Навуменка. Значны ўплыў на вучобу, робіць і прыём абітурыентаў ва універсітэт, які невядома чаму расцягнулі амаль на паўгода.

У дзелавой, прынцыповай гутарцы прайшло 7 гадзін сходу. Дарэчы, спрэчкі былі настолькі разнастайнымі і абгрунтаванымі, што сакратар партбюро адмовіўся ад заключнага слова, саслаўшыся на тое, што яму няма чаго дапоўніць.

Партыйная арганізацыя філалагічнага факультэта — адна з лепшых ва універсітэце. У яе шэрагах знаходзіцца многа выдатных камуністаў, самаадданых справе партыі і ўрада і ёсць упэўненасць у тым, што новавыбранае партбюро і яго сакратар С. А. Гусак справяцца з ўскладзенымі на іх абавязкамі.

# РАСКАЗВАЮЦЬ

## ШТУРМУЕМ КРЭПАСЦЬ ВЕДАЎ

У аудыторыі — цішыня. Ідзе лекцыя. 125 студэнтаў — першакурснікаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры слухаюць выкладчыка народнай вусна-паэтычнай творчасці Ніла Сямёнавіча Гілевіча. Захапляюча, жыва апавядае Ніл Сямёнавіч аб вялікай мудрасці беларускага народа. Свой расказ ён падмацоўвае канкрэтнымі фактамі, называючы тыя ці іншыя песні, паданні, казкі нашага народа. Добра, што матэрыял лекцыі мае цесную сувязь з нашым сучасным.

Усё старанна заканспектоўваюць студэнты. З розных куткоў нашай рэспублікі прывяла іх сюды адзіная мара — прысвяціць сябе дасканаламу вывучэнню беларускай мовы, культуры свайго народа. З сінявокага прыдняпроўя і зялёнага прынямоння, з Гродзеншчыны і Віцебшчыны прыехалі сюды юнакі і дзяўчаты — унукі і праўнукі гордых продкаў Беларусі...

Амаль цэлы месяц працавалі мы на уборцы бульбы ў саўгасе «Ждановічы». Там, за гэты невялікі час мы паспелі пазнаёміцца адзін з адным, моцна пасябравалі.

І вось ужо прайшло тры тыдні нашых першых дзён вучобы ва універсітэце. Трэба сказаць, што навука — крэпасць, браць якую дастаецца нялёгка. Але — мы упартыя, настойлівыя. І гэтая крэпасць будзе намі узята.

Мы, будучыя філолагі, вывучаем зараз беларускую, рускую, замежную мовы, багатую літаратурную спадчыну народаў свету. І нам дапамагаюць у гэтым такія знаўцы літаратуры і мовы, як Ул. С. Карабан, Н. І. Лапідус, Н. С. Гілевіч і іншыя.

Але не толькі вучобай жывём мы. Сярод студэнтаў нашага аддзялення шмат аматараў спорту. Таму ўжо зараз будучыя Яшыны і Брумелі займаюцца у розных спартыўных секцыях, спаборнічаюць паміж сабой. Амаль кожны — аматар паэзіі. Членамі літаратурнага аб'яднання «Узлёт» пры газеце «Беларускі універсітэт» з'яўляюцца нашы аднакурснікі Леў Бартош, Яўген Хвалей, Генадзь Пашкоў, Яўгенія Янішчыц, Алена Руцкая, Уладзімір Гураль.

З кожным днём студэнцкае жыццё становіцца цікавейшым і цікавейшым. Разам з вучобай у нас у плане — знаёмства з музеямі, цікавымі гістарычнымі месцамі, шматлікімі помнікамі роднай сталіцы. Вечарам студэнты — у бібліятэцы. Яны перагортваюць старонкі кніжак, неабходных падручнікаў, імі штурмуецца крэпасць ведаў.

**Віктар ЯРАЦ,**
**Алесь РАЗАНАЎ,**
**Віктар ДАРАШКЕВІЧ,**
**студэнты першага курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**



*Ідуць практычныя заняткі на фізфаку.*
*НА ЗДЫМКУ: Ніна ЯКАВЕНКА на «выдатна» справілася з пастаўленай выкладчыкам задачай.*

*Фота А. КАДЗЕТА*

# «МНЕ Б ХАЦЕЛАСЯ ПАЖАДАЦЬ...»

У камсамольскіх арганізацыях універсітэта ідуць справаздачы. Значыць, пройдзен яшчэ адзін год слаўнай студэнцкай камсамоліяй. Ззаду засталіся цікавыя справы, поспехі і недахопы. Так, так і недахопы таксама.

Кожнаму хочацца хоць трошкі заглянуць у будучыню. Але дзеля гэтага неабходна ведаць і пройдзенае. І камсамольцы, як на вялікую нараду, прыходзяць на свае справаздачна-выбарчыя сходы.

Камсамольская арганізацыя юрыдычнага факультэта сабралася на свой форум 5 кастрычніка. Скажам адразу: сапраўднай нарады не адбылося. Каб глыбей прааналізаваць работу камітэта за год і вызначыць важнейшыя задачы на будучае, сакратар камітэта юрфака Сяргей Саўчанка просіць... 25 хвілін. Ужо адно гэта павінна было насцярожыць камсамольцаў, але... яны упарта запатрабавалі скараціць час справаздачы сакратара да... 5 хвілін. Праўда, прагаласавалі за 20.

Сапраўднай гарачай размовы на сходзе не атрымалася. І не таму, што скарацілі час дакладчыку, а таму, што дакладчык прышоў на сход не са справаздачай камітэта камсамола аб рабоце за год, а толькі са сваімі асабістымі пажаданнямі.

У сваёй дваццаціхвіліннай інфармацыі ён і не спрабаваў падвесці вынікі камсамольскіх спраў, прааналізаваць іх. Адчувалася, што дае справаздачу не камітэт камсамола, а адзін чалавек-сакратар. У гэтым, безумоўна, галоўная бяда Саўчанкі. Ён, калі меркаваць па дакладу, не мог згуртаваць камітэт і ўзначаліць яго работу на працягу ўсяго справаздачнага перыяду. Таму ў дакладзе часцей за ўсё гучалі словы: «Мне хацелася б пажадаць новавыбранаму камітэту...» Ды і аб якой сур'ёзнай рабоце камітэта можна гаварыць, калі сам сакратар прызнаўся, што галоўную, самую адказную работу — кіраўніцтва вучобай — «упусцілі з-пад увагі». Да таго ж некаторыя члены камітэта і камсоргі груп самі не вызначаюцца паспяховасцю і дысцыплінай. Так, член камітэта камсамола факультэта Валеры Кірылаў мае акадэмічную запазычанасць, больш чым на тыдзень спазніўся на заняткі. Мае акадэмічную запазычанасць і камсорг цяперашняга трэцяга курса Леанід Сітнік. Гэтыя факты гавораць самі за сябе. Камсамольцы юрфака несур'ёзна падыходзілі да выбараў сваіх важакоў.

Праўда, з выступленняў у спрэчках можна было зразумець, што камсамольцы факультэта у сваёй большасці нездарма пражылі год: былі цікавыя справы. Студэнт трэцяга курса Пётр Каваленка расказаў аб выдатных справах сваіх сяброў на будоўлях Сібіры, а члену камітэта Галіне Лоўкіс было што сказаць аб поспехах факультэцкіх «артыстаў», якія занялі на аглядзе мастацкіх калектываў універсітэта другое месца.

Большасць выступаючых правільна адзначала недахопы у рабоце арганізацыі. Студэнт першага курса Ігнат Гаціла сказаў, што даклад сакратара бяззубы, без усякага аналізу. А які даклад — такія і выступленні.

Камсамолец Леанід Прошын крытыкаваў работу камітэта, які ўпускаў з-пад увагі многія пытанні студэнцкага жыцця — вучобу, выхаванне будучых спецыялістаў. Адзін той факт, што 14 студэнтаў трэцяга курса яшчэ дагэтуль маюць акадэмічную запазычанасць падцвярджае гэта.

З добрымі, канкрэтнымі прапановамі і парадамі, як палепшыць камсамольскую работу факультэта выступіў дэкан Васіль Адамавіч Шкурко. Каштоўныя прапановы былі і у іншых выступленнях.

Камсамольскі сход выбраў новы састаў камітэта. Сакратаром яго стаў добры таварыш, член КПСС студэнт другога курса Георгій Дарогін. Хочацца выказаць упэўненасць, што камсамольцы юрыдычнага факультэта не памыліліся у сваім выбары.

На юрфаку ужо пачаў сваю работу новы састаў камітэта. На іншых жа факультэтах камсамольскія актывісты вядуць падрыхтоўку да справаздачных сходаў. У іх ёсць яшчэ час сур'ёзна падумаць, і аб справаздачных дакладах, і аб арганізацыі сходаў. Трэба, каб на іх ішла адкрытая размова аб поспехах, аб недахопах, каб ва усіх выступленнях гучалі не толькі словы: «Мне б хацелася пажадаць»...

**А. КРУГЛОЎ,**
**аспірант.**

# ПЕРШАКУРСНІКІ



Заўсёды мнагалюдна ва універсітэцкай бібліятэцы, асабліва цяпер, калі пачаліся семінарскія ў першакурснікаў.

## ІНТЭРВ'Ю ДАЮЦЬ СТУДЭНТЫ ПАДРЫХТОЎЧАГА ФАКУЛЬТЭТА

### НАШ ДЭВІЗ — ВУЧОБА

Нібы вясною, усё заліта пяшчотнымі праменнямі сонейка: і прамыя вуліцы, і высокія будынкі, і дрэвы з асеннімі жоўта-чырвонымі лісцямі. Нам, студэнтам, нядаўна прыехаўшым у Мінск з далёкага В'етнама, было цёпла не столькі ад сонечных праменняў, колькі ад цяпла сяброўскіх сэрцаў савецкіх людзей.

Мінск нам вельмі спадабаўся. Хоць мы займаеся на падрыхтоўчым факультэце БДУ імя Ул. І. Леніна толькі другі месяц, але паўсюдна адчуваем вялікія клопаты і неабходную дапамогу з боку універсітэта. Я хачу ад імя ўсіх в'етнамскіх студэнтаў падрыхтоўчага факультэта падзякаваць рэктару універсітэта, дэканату падрыхтоўчага факультэта, усім выкладчыкам.

Ад савецкіх людзей мы даведаліся аб гістарычным мінулым Мінска, аб моцных разрушэннях, прынесеных вайной.

Аднак савецкі народ не стаў на калені. На ўсіх акупіраваных тэрыторыях узніклі партызанскія зоны. У выніку жорсткай барацьбы Савецкай Арміі, партызан, усіх савецкіх людзей вораг быў разгромлен. Савецкія людзі не толькі перамаглі нямецка-фашысцкіх захопнікаў, але паспяхова залячылі раны вайны, аднавілі сваю краіну.

Мы сваімі вачыма ўбачылі тое, што было пабудавана савецкім народам за пасляваенныя дваццаць з лішнім гадоў.

Студэнты падрыхтоўчага факультэта пабывалі ў дзіцячых садах беларускай сталіцы і бачылі, якія велізарныя клопаты аб падрастаючым пакаленні праяўляюць партыя і ўрад у СССР.

За час знаходжання ў вашай краіне мы ўпэўніліся ў тым, наколькі адзіныя імкненні савецкага і в'етнамскага народаў да міру. Аднак, у выніку агрэсіі ЗША міралюбівы в'етнамскі народ вымушаны быў узяцца за зброю і зараз пад кіраўніцтвам сваёй партыі, пры падтрымцы і дапамозе брацкіх народаў сацыялістычнага супольніцтва і ўсіх прагрэсіўных людзей зямнога шара вядзе справядлівую барацьбу супраць агрэсараў за вызваленне і аб'яднанне сваёй радзімы. Мы цвёрда ўпэўнены ў сваёй перамозе над ворагам, бо мы хочам жыць свабодна, бо ніхто і нішто не можа перашкодзіць нашаму гераічнаму народу ў рашучай барацьбе за поўную перамогу.

Мы, в'етнамскія студэнты, будзем настойліва вучыцца, каб апраўдаць давер'е нашага народа, які паслаў нас на вучобу ў такі цяжкі час для нашай Радзімы.

**Нгуен ЧА,**
**прэзідэнт зямляцтва в'етнамскіх студэнтаў падрыхтоўчага факультэта.**

### МЫ ЎДЗЯЧНЫ

Няма нічога больш прыемнага, чым прайсціся па горадзе.

Так і на гэты раз. Мы прышлі ў дзіцячы сад № 125. Загадчыца яго расказала нам аб умовах догляду і выхавання дзяцей, аб саміх дзецях. Затым нам паказалі светлыя пакоі, дзе дзеці жывуць, гуляюць, пяюць, абедаюць. Калі мы, абышоўшы сад, вярнуліся ў залу, то тут нас чакаў сюрпрыз. Мы ўбачылі дзяцей з шырокараскрытымі ад здзіўлення вачыма, яны глядзелі на нас, незнаёмых ім людзей. Але мы хутка пазнаёміліся. Дзеці паказалі нам свой канцэрт. Яны расказвалі вершы, спявалі песні, танцавалі. Мы, прызнацца, ніколі не прысутнічалі на такім тэатральным прадстаўленні. Гэта было для нас цікавай і дзіўнай навіной. Вельмі прыемна было слухаць моцныя, звонкія галасы хора. Мы смяяліся ад усёй душы. І кожны носіць у сваім сэрцы добры ўспамін аб гэтым дні.

Мы ўдзячны тым, хто даў нам магчымасць наведаць дзіцячы сад.

**Антуан Гала,**
**студэнт з Конга (Бразавіль).**

### УРАЖАННІ — ЗАХАПЛЯЮЧЫЯ

Пакінуў родную зямлю з такой думкай: «Я еду вучыцца ў братнюю краіну. Гэта так патрэбна».

І зараз адчуваю сябе, як дома. Я і мае сябры бачым тут тое, чаго няма ў нас, але што, магчыма, будзе ў недалёкім будучым.

Мы бачым тут зусім іншае жыццё, іншую цывілізацыю. Тут усё цудоўнае. І дзіцячы сад, які мы наведалі, адно з гэтых цудаў. Сярод дзяцей уладарыць дух незвычайнага ўзаемаразумення. У іх адна тут на ўсіх радасць. Яны—будучае пакаленне. І таму аб іх клапоцяцца, іх выхоўваюць, добра даглядаюць. Тут іх рыхтуюць да сапраўднага чалавечага жыцця.

Я літаральна раскрыў рот, калі пяцігадовая дзяўчынка даволі ўпэўнена запрасіла мяне на танец. Захапляюча! Дзіву даешся!

І мне хочацца сказаць, убачыўшы ўсё гэта:

—Няхай жыве дружба паміж савецкім і афрыканскім народамі!

— Няхай жыве СССР!

—Няхай жыве Афрыка!

**Альбер КІЙІНДУ,**
**студэнт падрыхтоўчага факультэта (Афрыка).**

### ДРУЖБЕ МАЦНЕЦЬ

У Маскву група афрыканскіх студэнтаў прыляцела на савецкім лайнеры. Тут я і мой сябра з Замбіі Алік Мвева былі накіраваны на вучобу ў Мінск, на падрыхтоўчы факультэт БДУ імя Ул. І. Леніна.

Сталіца Беларусі прыняла нас, як ласкавая маці. Нас сустрэлі, размясцілі ў інтэрнаце, а пасля пачаліся заняткі. Я думаў, што ніколі не змагу вывучыць рускую мову, бо не ведаў нават, як прывітацца па-руску. Але вось не прайшло і двух месяцаў, а я ўжо крыху магу размаўляць з савецкімі сябрамі.

У паспяховым авалодванні рускай мовай нам дапамагае і тое, што на факультэце для нас праводзіцца шмат экскурсій, сустрэч з савецкімі людзьмі. Мы наведалі Малую Беларускую чыгунку, Палац піянераў і школьнікаў, а таксама дзіцячыя сады, дзе дзеці ва ўзросце ад трох да пяці гадоў здзівілі нас сваімі канцэртамі. Мы пабывалі на экскурсіі ў месцах падполля горада Мінска ў гады Вялікай Айчыннай вайны, калі ўвесь савецкі народ ад малога да старога падняўся на рашучую і жорсткую барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

А нядаўна мы завіталі ў Акруговы дом афіцэраў, дзе ў той час даваў канцэрт Дзяржаўны ансамбль танца Беларускай ССР, якім кіруе заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, заслужаны артыст УССР Аляксандр Апанасенка. Гэты ансамбль мае багаты рэпертуар. Ён папулярны, як мы даведаліся, не толькі ў Беларусі, але і за межамі Савецкага Саюза. Усе нашы студэнты вельмі задаволены, што атрымалі магчымасць у той вечар пазнаёміцца з тэатральным мастацтвам БССР і народаў свету.

Мы дружна апладыравалі ансамблю Аляксандра Апанасенкі. Мы жадаем яму далейшых творчых поспехаў.

**Ісайя СІБАНДА,**
**студэнт падрыхтоўчага факультэта (Афрыка).**



Кожнае слова, запісанае ў канспекце на лекцыі абавязкова спатрэбіцца ў будучым—так лічаць студэнты-першакурснікі гістарычнага факультэта.

# ЧАЛАВЕК НАВУКІ



**19 кастрычніка спаўняецца 60 гадоў прафесару кафедры беларускай мовы, доктару філалагічных навук Марыі Андрэеўне Жыдовіч. Пройдзены слаўны шлях служэння савецкаму народу, зроблены вялікі ўклад у развіццё беларускага мовазнаўства.**

**Біяграфія М. А. Жыдовіч — гэта біяграфія пакалення, выхаванага Вялікім Кастрычнікам. Дачка селяніна — былога панскага парабка з Дукоры пасля заканчэння народнага вучылішча працавала ў саўгасе, потым вучылася ў Магілёўскім педтэхнікуме, чатыры гады настаўнічала ў пачатковай школе вёскі Бярозкі пад Хоцімскам. Цяга да навукі прывяла яе неўзабаве ў Мінскі пединстытут імя М. Горкага, які М. А. Жыдовіч закончыла ў 1938 годзе і была пакінута ў аспірантуры для спецыялізацыі па гісторыі роднай мовы. Старанную працу над вывучэннем старажытных помнікаў яна сумяшчала з выкладаннем сучаснай беларускай мовы на гістфаку пединстытута.**

**У часе Вялікай Айчыннай вайны М. А. Жыдовіч працуе ў сярэдняй школе на Урале. Там, далёка ад радзімы, яна заканчвае кандыдацкую дысертацыю на тэму: «Мова Супральскага летапісу», якая была абаронена ў Маскве (1944), а з 1945 г. Марыя Андрэеўна— дацэнт БДУ. У гэтым жа годзе адбылася яшчэ адна вялікая падзея ў яе жыцці — М. А. Жыдовіч стала членам КПСС. Потым праца ва універсітэце, Інстытуце мовазнаўства АН БССР, дзе яна загадвала сектарам гісторыі мовы. Многа часу М. А. Жыдовіч аддала збору мясцовых гаворак для дыялекталагічнага атласа беларускай мовы, удзельнічала ў напісанні калектыўных прац: «Нарысы па гісторыі беларускай мовы», «Курс сучаснай беларускай мовы», складанні «Бібліяграфічнага ўказальніка літаратуры па беларускаму мовазнаўству». Адначасова М. А. Жыдовіч паспяхова абараняе доктарскую дысертацыю па тэме: «Назоўнік» (1958 г.).**

**Цяпер прафесар М. А. Жыдовіч чытае курс лекцый па гісторыі роднай мовы, працуе над гістарычнай фанетыкай, удзельнічае ў дыялекталагічных экспедыцыях па збору матэрыялу для слоўніка мінска-маладзечанскіх народных гаворак. Па-ранейшаму яна шмат увагі ўдзяляе падрыхтоўцы навуковых кадраў, з'яўляецца лепшым дарадчыкам моладзі, што бярэцца за нялёгкую, але пачэсную працу ў галіне беларускага мовазнаўства. Сярод былых вучняў М. А. Жыдовіч, якія пачыналі першыя крокі ў навуку пад яе кіраўніцтвам, ёсць ужо дактары навук, звыш дзесятка кандыдатаў навук. Кожны з іх памятае навуковую дапамогу, сяброўскія парады і прынцыповыя шчырыя заўвагі Марыі Андрэеўны.**

**Дарагая Марыя Андрэеўна! Вашы сябры і вучні, а таксама студэнты філалагічнага факультэта вітаюць Вас з юбілеем, ад усяго сэрца жадаюць добрага здароўя, доўгіх год жыцця, плённых творчых поспехаў на карысць нашай савецкай навукі!**

